# ВОЧЫ ЯК МАСТАЦКІ ПРЫЁМ СТВАРЭННЯ ВОБРАЗА Ў РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА "КАЛАСЫ ПАД СЯРПОМ ТВАІМ"

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Скіба Л.А., студэнтка 1 курса лячэбнага факультэта**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.

Аднолькавых людзей не бывае, у кожнага чалавека ёсць нешта сваё, уласцівае толькі яму аднаму. Кожны пісьменнік, у тым ліку і Ул.Караткевіч, для адлюстравання ўнікальнасці, адзінкавасці свайго героя мае свае мастацкія сродкі, якія дапамагаюць намаляваць цікавы вобраз. Асаблівая роля ў гэтым надаецца дэталям партрэта, якія характарызуюць унутраны свет персанажа. Безумоўна, Ул. Караткевіч з'яўляецца майстрам у стварэнні непаўторных вобразаў. Важны прыём, які дазваляе паказаць сутнасць чалавека, – апісанне вачэй.

Выраз вачэй, позірк, колер, форма з'яўляюцца неад'емнай часткай партрэта герояў рамана Ул. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім". У час даследавання было выяўлена 253 прыклады, у якіх аўтар выкарыстоўвае прыметнікі, дзеясловы, назоўнікі, прыслоўі, якія сустракаюцца ў спалучэнні са словам вочы.

Перш за ўсё, позірк чалавека адлюстроўвае пачуцці героя, выкліканыя яго адносінамі да акружаючых людзей Гэта могуць быць розныя прыемныя станы душы чалавека: спакой, душэўнасць, пяшчота, дабрыня. "А **вочы** Марцінкевіча раптам, на адно імгненне, **перасталі быць усмешлівыя**, **зірнулі** на хлопца **добразычліва**, **цвёрда**". У рамане Ул. Караткевіча дастаткова прыкладаў, калі вочы выражаюць гнеў, дзёрзкасць, жорсткасць, нават нянавісць. Можна выдзяліць такую групу эмоцый, як здзіўленне, страх, жах, сорам, расчараванне. "Алесь **шырока расплюшчанымі вачыма глядзеў на ўсё** гэта, быццам з заўтрашняй раніцы яму выпадала жыць зусім пад іншым небам, без гэтай Вечарніцы…"

Такім чынам, вачыма можна перадаць цэлую гаму эмоцый і перажыванняў: ад пяшчоты і радасці да дзёрзкасці, нянавісці.

Мы прасачылі і заўважылі, што колер вачэй адыгрывае пэўную ролю ў стварэнні вобразаў у творы. У рамане пераважае сіні колер вачэй і яго адценні па частаце ўжывання: светла-сіні, васільковы, блакітны, цёмна-блакітны. Побач з прыметнікамі, якія абазначаюць колер, Караткевіч заўсёды выкарыстоўвае эпітэт, што дае магчымасць уявіць героя, зразумець яго характар. "Лялечны тварык схіліўся ўніз. **Вочы**, **такія нявінныя і сінія**, **засаромлена глядзелі** на Алеся".

У творы Ул. Караткевіча размова вачэй паказвае ўсю напружанасць дзеяння. Колькі перажыванняў, бура эмоцый паказана аўтарам у сцэне сустрэчы імперыятрыцы і Акіма. "**А спакойныя вочы даказалі: "Помню". "І я не магу забыць", – адказалі яе вочы. І раптам горыч сціснула яе сэрца.** Вось зноў



Репозиторий ГрГМУ

бяжыць рака, зноў серабрыцца палын, як шкура гэтай лісы, зноў стаіць Ён. **Нічога не змянілася. Толькі непапраўна пастарэла, толькі змянілася яна сама"**.

Пісьменнік ў сваім творы карыстаецца рознымі моўнымі сродкамі выразнасці для апісання вачэй. Перш за ўсё, гэта ўжыванне шматлікіх эпітэтаў і прыслоўяў у пераносным значэнні, якія ярка апісваюць як станоўчых, так і адмоўных герояў. Цікава выкарыстоўваюцца ў творы дзеясловы. Менавіта яны даюць магчымасць творцу перадаць усе адценні позірку, што дазваляе наблізіць героя да чытача, зрабіць яго зразумелым і цікавым. Яркія каларытныя вобразы стварае Ул. Караткевіч пры дапамозе параўнанняў. Дэтальны, прадуманы адбор кожнай моўнай адзінкі дазваляе аўтарувыступіць у якасці тонкага псіхолага, які адкрывае душу свайго героя.

## УМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ АРФАГРАФІЧНАГА НАВЫКУ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»
**Турок А.Ч., студэнтка 5 курса педагагічнага факультэта**
Кафедра прыродазнаўчых і лінгвістычных дысцыплін і методык іх выкладання
Навуковы кіраўнік – канд. філал.навук, дацэнт Лапкоўская А.М.

Пытанне пра эфектыўнасць навучання арфаграфіі застаецца важным і ў XXI ст., бо валоданне арфаграфічна правільным пісьмом разглядаецца як адна з найважнейшых мэт навучання беларускай мове, паказчык моўнага і маўленчага развіцця вучняў. В.У. Протчанка падкрэсліваў, што працэс фарміравання арфаграфічных навыкаў – «мэтанакіраваная, штодзённая, свядомая, метадычна наладжаная інтэлектуальная, мнеманічная і мускульная праца з моўнымі з'явамі розных лінгвістычных узроўняў» [4, с.187], асноўныя мэты якой рэалізуюцца толькі падчас актуалізацыі практычнай маўленчай дзейнасці. Аднак практыка навучання пацвярджае наяўнасць шматлікіх арфаграфічных памылак у працах вучняў.

Адной з галоўных прычын парушэнняў у фарміраванні арфаграфічных навыкаў з'яўляецца недастатковая ўвага да навучання школьнікаў аперацыйнай дзейнасці, што прыводзіць да «стыхійных» прыёмаў мыслення і як вынік – да памылковага напісання арфаграм. Дляразвіцця арфаграфічнага навыку метадысты прапануюць вызначыць яго структуру, акрэсліць моманты, якія могуць выклікаюць цяжкасці пры яго фарміраванні, пераканаць вучня ў неабходнасці захавання той ці іншай паслядоўнасці дзеянняў. У якасці яшчэ аднаго значнага этапа разглядаецца аналіз вучнем уласных дзеянняў, што будзе найбольш эфектыўным на апошніх этапах навучання арфаграфіі.

Для паспяховага фарміравання арфаграфічнага навыку неабходныя пэўныя ўмовы: 1) развіццё фанематычнага слыху і арфаграфічнай пільнасці; 2) разуменне моўных значэнняў; 3) авалоданне ўменнямі і простымі навыкамі,



Репозиторий ГрГМУ